УДК 811.161.3'373.421:630

# КЛАСІФІКАЦЫЯ АНТАНІМІІ Ў ТЭРМІНАХ ЛЯСНОЙ ГАСПАДАРКІ

***Гуліцкая Т. П., ст. выкл.***

*Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Антанімія кваліфікуецца як тып семантычных адносін, які адыгрывае важную ролю ў класіфікацыі навуковых паняццяў і іх структураванні. Тэрміны, звязаныя антанімічнымі адносінамі, з пункту гледжання семантычнай класіфікацыі (згодна з класіфікацыяй Л. А. Новікава) могуць быць кантрадыкторнымі, кантрарнымі, кампліментарнымі і канверсіўнымі [1, с. 190–241]. Такая класіфікацыя ахоплівае ўсе варыяты антанімічных зносін паміж супрацьлеглымі аб'ектамі, іх прыкметамі і асаблівасцямі.

Антонімы, якія адпавядаюць фармальна супрацьлеглым паняццям, выступаюць у мове як супрацьлеглыя і не маюць прамежкавага ланцужка адносяцца да кантардыкторных антонімаў [1, с. 94]. Такія антонімы з'яўляюцца ўзаемавыключальнымі: натуральны адбор – штучны адбор; дамінантны ген – рэцэсіўны ген; монакарпічныя расліны – полікарпічныя расліны. Часта можна сустрэць пары аднакаранёвых слоў, у якіх прысутнічае адмоўны словаўтваральны прэфікс, які ўказвае на адсутнасць прыкметы: занальны ландшафт – азанальны ландшафт, прадукцыйнасць глебы – непрадукцыйнасць глебы.

Да кантрарных тэрмінаў-антонімаў адносяцца тэрміны, якія выражаюць якасную супрацьлегласць, паступовую змену прыкметы. У такіх антонімаў магчыма пабудова градуальных апазіцый [2, с. 44], паколькі яны характарызуюцца адносінамі не ўзаемавыключэння, а процілегласці, а таму не дапускаюць адмоўнай трансфармацыі Звычайна паміж членамі антанімічнай парадыгмы маецца сярэдні, прамежкавы элемент: высокапаўнотны дрэвастой – нізкапаўнотны дрэвастой, высокапрадукцыйны дрэвастой – нізкапрадукцыйны дрэвастой.

Камліментарнымі антонімамі прынята лічыць антонімы, якія выражаюць прыкмету дадатковасці. «Кампліментарныя тэрміны-антонімы раскрываюць адзін з бакоў паняцця, вербалізаванага родавым тэрмінам» [3, с. 57]. Асновай такіх антонімаў з'яўляюцца відавыя супрацьлеглыя паняцці, якія дапаўняюць адзін аднаго да выражэння пэўных межаў той ці іншай прыкметы: гетэратрофы – аўтатрофы; гамагенны ландшафт – гетэрагенны ландшафт. Таму пашырэнне кампліментарнай антанімічнай пары нейтральным кампанентам немагчыма, у такіх тэрміналагічных парах, як правіла, суадносіцца род і від

Да канверсіўных ці вектарных амонімаў адносяцца антонімы, звязаныя з выражэннем супрацьлеглай накіраванасці прыкмет, дзеянняў, працэсаў. Такі тып антаніміі прадстаўлены аднакаранёвымі парамі тэрмінаў, адзін з якіх пабудаваны пры дапамозе тэрмінаэлемента, што выражае спрацьлегласць: вертыкальнае азеляненне – гарызантальнае азеляненне; унутрыладшафтныя ўзаемасувязі – міжландшафтныя узаемасувязі.

Асэнсаванне тэрмінаў на аснове проціпастаўлення іх значэнняў спрыяе больш дасканаламу ўсведамленню паняццяў, іх месца і ўзаемадзеяння у межах тэрмінасістэмы.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Новиков, Л. А. Семантический анализ противоположности в лексике / Л. А. Новиков // Новиков Л. А. Избранные труды. Т. 1: Проблемы языкового значения. – М.: Изд-во РУДН, 2001. – С. 17–337.
2. Разводовская, Я. В. Антонимия в терминологии языка: на материале лексики репродуктивного здоровья английского, русско-го и белорусского языков / Я. В. Разводовская // Вес. БДПУ. Сер. 1, Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2013. – № 4 (78). – С. 42–45.
3. Таранова, Е. Н., Ермакова, Л. Р., Бубырева, Ж. А. Терминологическая синонмия и антонимия в лексике русского и немецкого языка (на примере терминов ландшафтоведения) / Е. Н. Таранова // Вопросы журналистики, педагогики, языкознания. – 2016. – №14. – С. 55–60.